Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 10 (252) | Субота, 24 сакавіка 1956 года. | Цана 20 кап.

ХУТКА ЭКЗАМЕНЫ

На семінарскіх занятках

АБМЕН КОМСАМОЛЬСКІХ ДАКУМЕНТАЎ

★

РЫХТУЮЦЦА ДА ЭКЗАМЕНАЎ

— Хто жадае сёння адказваць? — звярнууся выкладчык т. Кляучэня да студэнтаў. Адразу паднялося некалькі рук. Выкладчык назвау прозвішча В. Катляра. Студэнт устау і пачау адказваць на першае пытанне.

Аднакурснікі ўважліва слухаюць яго, бо ведаюць, што Віктар заусёды добра рыхтуецца да семінарау, умела карыстаецца падручнікамі, акуратна канспектуе важнейшыя работы класікау марксізма-ленінізма. Вось і сёння ў яго адказе адчуваецца глыбокае веданне матэрыялу, паслядоунасць у раскрыцці тэмы. Выкладчык задаволены адказам.

Комсамольцы 1-га курса аддзялення геаграфіі зараз ужо пачалі рыхтавацца да экзаменау. Іх можна заусёды бачыць у чытальнай зале, у кабінетах. Таму на семінарах і практычных занятках яны паказваюць грунтоунае засваенне лекцыйнага матэрыялу. Асабліва радуюць сваімі адказамі Г. Дзяруга, К. Кудло, З. Аляксеева, В. Баркун, Ш. Некрашэвіч і Л. Лазоускі.

В. БОЛДЫШЭУ,
студэнт І курса геафака.

Актыўнасць узрастае

Большасць студэнтаў III групы II курса юрфака добрасумленна рыхтуюцца да семінарскіх заняткаў па асновах марксізма-ленінізма, таму што вялікае значэнне мае вывучэнне гэтай дысцыпліны для маладога спецыяліста. На пытанні семінарскіх заняткаў студэнты даюць дакладныя, вычарпальныя адказы. Асабліва добра і абгрунтавана адказваюць комуніст Б. Серафімовіч, комсамольцы А. Шынгель, Н. Сторажаў, А. Пракопенка. Праўда, у нас ёсць некаторыя таварышы, якія недастаткова сур'ёзна адносяцца да вывучэння данай дысцыпліны. Гэта тт. Л. Дубровскі, В. Друзь, А. Столпнік.

Аднак у цэлым семінары праходзяць пры узрастаючай актыўнасці. І можна спадзявацца, матэрыялы XX з'езда КПСС у нашай групе будуць глыбока вывучаны.

В. ПАЎЛОВІЧ,
студэнт II курса юрфака.

Ідуць практычныя заняткі

Многа, вядома, не патрэбна гаварыць аб тым вялікім значэнні, якое маюць практычныя заняткі для замацавання пройдзенага матэрыялу, для набыцця навыкаў у далейшай самастойнай рабоце.

На нашым курсе праходзяць практычныя заняткі па мінералогіі і па метадах распрацоукі карысных выкапняў. Заусёды на гэтых занятках адчуваецца працоуная абстаноука: кожны студэнт занят сваёй работай. Адны вызначаюць мінералы у адлюстраваным святле, другія падлічваюць запасы месцанараджэння карысных выкапняў, трэція вызначаюць адлегласць паміж горнымі выпрацоукамі пры разведцы месцанараджэння і г. д.

У нашай падгрупе усе добра спрауляюцца з гэтымі задачамі; прауда, часта не зусім удала, але пры дапамозе выкладчыкаў заусёды прыходзяць да ісціны. Можна адзначыць такіх студэнтаў, як Б. Гурскі, З. Дзікалава і іншых, якія заусёды добра рыхтуюцца да заняткаў і маюць нядрэнныя вынікі ў вырашэнні практычных задач.

Я думаю, што мы яшчэ больш удзелім увагі практычным заняткам. Кожны павінен паставіць сабе задачу—ці можа ён самастойна вырашыць тыя або іншыя практычныя пытанні? Калі не, то з двайным намаганнем трэба узяцца зараз за вырашэнне гэтых неадкладных задач.

А. ЛАЗОЎСКІ,
студэнт IV курса аддзялення геалогіі.

Сур'ёзная размова

Цікавым і захапляючым жыццё калектыва можа стаць тады, калі групорг будзе добра ведаць людзей. Трэба займацца з кожным комсамольцам, ведаць яго схільнасці, густы. Я упэунен, што калі групорг добра ведае сваіх студэнтаў і гарыць жаданнем працаваць — вынікі заусёды будуць бачны.

На працягу некалькіх гадоў аб нашым курсе заусёды гаварылі на факультэце як аб самым дрэнным. Не было ў нас згуртаванага, добрага комсамольскага калектыва. Кожны быў прадстаулен па сутнасці справы самаму сабе. Адсюль і вынікі—частыя парушэнні дысцыпліны комсамольцамі нашай групы.

У мінулым годзе мяне выбралі групоргам. Спачатку губляюся, не ведау, што рабіць і як. Вырашыу пачаць з сур'ёзнай размовы на групавым комсамольскім сходзе. Так і зрабіу. Першы сход прайшоу вельмі цікава, ажыулена. На сходзе зацвердзілі план работы і выканалі яго. Мы пачалі даваць комсамольскія даручэнні усім, а не адным і тым-жа асобам, як гэта было раней. Гэта дае нам магчымасць далучаць да жыцця калектыва кожнага комсамольца.

ГУРСКІ,
групорг IV курса геолага-геаграфічнага факультэта.

АБ ПАЛІТІНФАРМАЦЫЯХ

Кожную пятніцу студэнты нашай групы застаюцца паслухаць палітінфармацыі або навіны навукі і тэхнікі. Гэтыя мерапрыемствы ў нас у групе пачалі праводзіцца пасля прыезду студэнтаў з сельскагаспадарчых работ.

У другім семестры на першымжа сходзе мы вырашылі праз кожную пятніцу праводзіць палітінфармацыю, а у прамежках—гутаркі аб навінах навукі і тэхнікі. У гэтых гутарках студэнты прымаюць самы актыўны ўдзел. Выступіўшыя на апошняй гутарцы Гарошка і Верашчагін расказалі аб адкрыцці антыпратона. Тут можна пачуць аб вынаходніцтве вучонымі атамных гадзіннікаў, аб пакарэнні нашымі даследвальнікамі ільдоў Антарктыды, аб хуткім атрыманні вучонымі жывой істоты віруса і аб многім іншым.

БРАНІЦКІ,
групорг I курса хімічнага факультэта.

ГРУПА—ЦЭНТР ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ

14 сакавіка ва універсітэце камітэтам комсамола і рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт» быў праведзен семінар групоргаў па абмену вопытам работы. Выступіўшыя на семінары групоргі расказалі аб тым, як у групах вядзецца выхаваўчая работа, як студэнты рыхтуюцца да экзаменаў, аб групавых комсамольскіх сходах, аб грамадскай рабоце, аб цяжкасцях, з якімі даводзіцца ім сустракацца у штодзённай працы.

Было выказана многа каштоўных прапаноў аб тым, як лепш весці работу ў групе, каб сапраўды яна была цэнтрам выхаваўчай работы. Сёння мы публікуем выступленні некаторых групоргаў.

Лепш знаць сваіх комсамольцаў

З усёй Беларусі сабраліся студэнты нашага курса. Да паступлення ва універсітэт мы вучыліся у розных школах.

Ва універсітэце нам трэба стварыць новую, дружную студэнцкую сям'ю, здаровы калектыу. У гэтым мы, групоргі, бачылі асноўную задачу нашай работы. Ва усіх нас агульная мэта: стаць добрымі фізікамі.

Мы бліжэй пазналі адзін аднаго у час працы у калгасе. Калі мы звярнуліся у горад, адчувалася, што калектыу у нас ёсць. Усе падзеі, якія адбываюцца на курсе, хвалююць усіх нас. Ганебныя паводзіны асобных таварышаў у час работы у калгасе курс горача абмяркоўваў і строга асудзіу. Даведаушыся аб ганебных паводзінах студэнткі Чыркевіч (яна займалася крадзяжом), усе комсамольцы прышлі да вываду, што ёй не месца у комсамоле і ва універсітэце. Чыркевіч павінна сумленнай працай змыць ганебную пляму.

Жывем дружна, ходзім разам у тэатры, кіно, часта збіраемся групамі, слухаем музыку, спяваем. Але, як звычайна, бываюць выключэнні. Вельмі дрэнна, што справы курса для некаторых таварышаў абыякавы. Так, мы праводзілі вечар аб баявым шляху комсамола. Вечар зусім праваліуся. Удзельнікі самадзейнасці не прышлі. Пасля гэтага некаторыя зрабілі вельмі просты вывад: не прыходзіць на вечары, калі яны нецікавыя. А ці так павінны комсамольцы адносіцца? Трэба было зрабіць так, каб больш такіх вечароу не было. Мы павінны самі зрабіць работу цікавай, таму што чакаць дапамогі нам няма ад кага. Трэба, каб гэта дайшло да свядомасці кожнага комсамольца, каб кожны унёс частку сваёй работы ў агульную справу; крытыкаваць-жа мы усе можам, але калі нічога не рабіць, то і крытыка не дапаможа.

Цяпер мы рыхтуем вечар. Некаторыя зацікаулены у яго падрыхтоуцы і прымаюць актыуны удзел у самадзейнасці, напрыклад: Ала Ліпская, Ліля Раскіна, Артур Ляуковіч, Іван Манак.

Групоргі I курса аддзялення фізікі А. КУЗНЕЧЫК, В. СКУТАЎ, Л. КІСЯЛЕВА, Н. ПЕСЕНКА.

ВЕРЫЦЬ У ІНІЦЫЯТЫВУ КОМСАМОЛЬЦАЎ

Сапраўды, было аб чым хвалявацца. Сход павінен быу паказаць, як калектыу ацэньвае вынікі экзаменау, у чым прычына, што на курсе усё-ж маецца нездавальняючая адзнака, як палепшыць работу комсамольскага бюро ў другім семестры.

На сваю рызыку курсавое бюро адмовілася ад «звычайнага» метаду падрыхтоўкі сходаў, калі загадзя выдзяляюцца прамоуцы. Такі сход звычайна бывае сумным, нецікавым, акрамя падрыхтаваных, жадаючых выступаць, як правіла, не бывае. Мы рашылі даверыць усё сходу. І не памыліліся: комсамольцы горача і смела гаварылі аб недахопах работы комсамольскага бюро курса, аб безадказнасці некаторых комсамольцаў за даручаную справу. Сход цягнуўся ўжо тры гадзіны, а ў аудыторыі усё яшчэ падымаліся адна за другой рукі.

У чым-жа прычына поспеху схода? Па-першае, у вастрыні пытанняў, закранутых дакладчыкамі; па-другое, безумоўна, у тым, што кожны выступаючы ўносіу сваю жывінку пры абмеркаванні гэтых пытанняў.

Хочацца сказаць і яшчэ аб адным своеасаблівым сходзе, прайшоушым у пачатку першага семестра. На ім не пісалі пратакола, не устанаўлівалі рэгламент, ды і ў парадку дня значылася адно толькі пытанне: «Пагаворым аб справах нашых». Гэта была размова не толькі аб поспехах і недахопах комсамольскай работы на курсе. Комсамольцы асуджалі прагульшчыкаў, студэнтаў, якія дрэнна вядуць сябе ў адносінах да таварышаў, уносілі цікавыя прапановы. Зразумела, гэты сход дау нам больш карысці, чым, скажам, сход: «Аб дысцыпліне на курсе». Варта сказаць, што гарачыя спрэчкі па пытаннях, закранутых на сходзе, працягваліся некалькі дзён у час лекцыйных перапынкаў.

Трэба адмовіцца ад практыкі, калі комсамольскія сходы на курсах праходзяць толькі тады, калі гэтага патрабуе факультэцкае бюро ці дэканат. Больш веры ў ініцыятыву саміх комсамольцаў!

Комсорг II курса аддзялення журналістыкі П. БЕРАЖКОЎ.

Ці так трэба рыхтаваць сход

Добрую і карысную справу арганізаваў камітэт комсамола. Сённяшні семінар групоргау павінен дапамагчы нам зрабіць жыццё на курсе больш цікавым і змястоуным. Вельмі хочацца пачуць парады комсамольскіх важакоў лепшых груп, хочацца даведацца, як яны змаглі запаліць у студэнтаў гэты агеньчык сапраўднага жыцця.

Нядауна парашылі мы правесці на курсе вечар адпачынку. Усе старатоунасцю узяліся за справу, склалі праграму, падшукалі вершы і песні. Але чамусьці мы хутка астылі. Вось тут дапамога абавязкова патрэбна. Я упэунена што калі-б нам своечасова дапамаглі, то вечар быў-бы цікавым, захапляючым.

Хацелася-б пачуць і аб тым як падабраць тэму комсамольскага сходу, як яго правесці. Я згодна, што сход патрэбна рыхтаваць, але, па-мойму, не метадам групорга А. Геруса. Праводзіць сход па «шпаргалках», раней разданых комсамольцам — гэта значыць, што яны будуць проста адседжвацца, а гаварыць фактычна будзе адзін групорг.

Некалькі слоу аб культпаходах. У нас у групе усе любяць крытыкаваць, крычаць, што культпаходаў не арганізоуваем, а калі пачынаем збірацца, то прыходзяць пчаныя людзі. Па-мойму, гэта адбываецца таму, што самі культпаходы праходзяць нецікава. Было-б вельмі карысна пачуць, як праводзяць культпаходы іншыя групоргі. Няхай часцей камітэт комсамола праводзіць такія сустрэчы, а групоргі няхай пабольш гавораць не абстрактна, а аб рабоце на курсе, у групе, тады і справы пойдуць весялей.

М. СЕЛЯЕВА,
групорг II курса біяфака.

★ ★

У розных райкомах гарадоу краіны уступалі студэнты універсітэта ў рады Ленінскага комсамола. Колькі тады было хваляванняу, радасці! Кожны хацеу выдатна вучыцца, актыуна удзельнічаць у грамадскай рабоце свайго роднага калектыву. І кожны па-свойму знаходзіу у гэтым свае шчасце. З той пары прайшло нямала часу.

А сёння штосьці небывалае. Ідзе абмен комсамольскіх білетаў. Зноу хваляванні. Кожны прыкідвае у памяці шлях, пройдзены у радах ВЛКСМ. І калі што-небудзь было не зусім добра—чырванее. З новым комсамольскім білетам хочацца па-новаму уключыцца у грамадскую работу, па-новаму аднесціся да вучобы, яшчэ больш зрабіць добрага, каб укласці і сваю скромную долю працы у справы слаунага, няумітага атрада моладзі—Ленінскага комсамола.

Адзін за адным выходзяць радасныя, расчырванеушыяся студэнты I курса аддзялення журналістыкі з кабінета сакратара райкома М. Ф. Лунина. Там ім уручылі новыя білеты, павіншавалі, пажадалі поспехаў. А тут, ля дзвярэй, акружылі сябры.

— Барыс, віншую ад усяго сэрца,—кажа Іван Сіпакоу і паціскае руку сябру. Барыс усміхаецца ў адказ. Ён будзе вучыцца яшчэ лепш. З новым білетам—да новых поспехаў!

НА ЗДЫМКУ: Барыса Сачанку, студэнта I курса аддзялення журналістыкі, віншуе з атрыманнем новага білета яго сябра—Іван Сіпакоу.

БЛІЖЭЙ ДА ЖЫЦЦЯ, ДА ВЫТВОРЧАСЦІ

ЧЫТАЧЫ АБМЯРКОЎВАЮЦЬ АРТЫКУЛ ДАЦЭНТА БАРКАНА

Навуку да патрэб практыкі

Змешчаны у парадку абмеркавання газетай «Беларускі універсітэт» (№ 8 ад 10 сакавіка 1956 г.) артыкул дац. Баркана «Бліжэй да жыцця, да вытворчасці» ставіць вельмі важнае пытанне, якое прадвырашае перабудову работы вышэйшай школы у духу рашэнняў XX з'езда КПСС—пытанне аб набліжэнні вучобы студэнтаў да практыкі. Калі я прачытаў артыкул А. С. Баркана, многае у ім здалося мне вельмі цікавым і настолькі заслугоўваючым увагі, што, выкарыстаўшы наведванне школ і рэдакцый, дзе студэнты IV курса філфака праходзяць зараз практыку, я перад педагогамі і вопытнымі журналістамі ставіў пытанне аб тым, як, на іх погляд, прыблізіць нашу універсітэцкую падрыхтоўку спецыялістаў да практыкі.

У рэспубліканскай газеце «Звязда» многія вопытныя журналісты раілі узмацніць увагу да прафесійнага адбору у час прыёмных экзаменаў, г. зн. выключыць такое становішча, калі-б малады чалавек на парозе жыцця не любіў сваю прафесію. Пры прыёме трэба звяртаць больш увагі на канкрэтныя, дзелавыя, абгрунтаваныя рэкамендацыі школ, рэдакцый маладзёжных газет, комсамольскіх арганізацый.

Сустракае падтрымку прапанова дацэнта Баркана аб прымацаванні грамадскіх арганізацый універсітэта да школ, клубаў, прадпрыемстваў і лабараторый на усім працягу вучобы ці хаця-б з трэцяга семестра. Задача дэканатаў распрацаваць свайго роду графік паступовага і усё больш цеснага удзелу студэнтаў у практыцы школьнай работы. Патрэбна, напрыклад, ставіць у абавязак кожнаму студэнту да праходжання актыунай практыкі на 4 курсе мець стаж у правядзенні 5—6 вучэбных экскурсій на прадпрыемствы, у музеі, на выстаўку будаунічай тэхнікі, на сельскагаспадарчую выстаўку і г. д. Абсталяваць пэўны куток фізічнага або хімічнага кабінетаў, правесці 3—4 заняткі вучнёўскага гуртка, выступіць з лекцыяй або дакладам перад навучэнцамі, арганізаваць іменна у школе, а не у сваім толькі кругу, дыспут і г. д. Уся гэтая работа павінна праводзіцца пад назіраннем кафедр і грамадскасці універсітэта. Тады грамадская работа стане змястоуней, а навукоая і вучэбная — дакладней. Падрыхтоука будзе паступова прыкладацца да практыкі жыцця. Самі цяжкасці, якія такім чынам узнікнуць, пры іх пераадоленні многаму навучаць не толькі студэнтаў, але і нас, выкладчыкаў. Гэта дазволіць роунамерней размеркаваць гадзіны па кіраўніцтву педпрактыкай. Зараз асобныя выкладчыкі, метадысты універсітэта у 6-ці тыднёвы перыяд самой практыкі заняты ад зары да зары і усёроуна усіх студэнтаў ва усім роуна накіраваць і пракантраляваць фізічна не у стане. Калі практыка будзе, роунамерна нарашчваючыся, размяркоувацца паміж 3—4 курсамі, гэта прынясе толькі карысць.

Неабходна, на мой погляд, дамовіцца з органамі асветы аб удзеле і кафедр і студэнтаў пятых курсаў у так званых педагагічных чытаннях і асабліва у сістэматычна праводзімых настаўніцкіх канферэнцыях. Тады вытворчая практычная работа прадстане перад нашымі таварышамі наглядна і гэта дазволіць таму, хто без пяці мінут педагог, яшчэ і яшчэ раз суразмерыць свае сілы і задачы. Нямалаважнае значэнне мае запрашэнне практыкаў да удзелу у абмеркаванні тэматыкі саміх дыпломных работ выпускнікоу на кафедрах, а таксама больш дзелавыя, чым да гэтага часу, традыцыйныя сустрэчы, на якіх хацелася-б бачыць агульную зацікаўленасць у падняцці практычнай работы да узроуню сучаснай навукі і у набліжэнні навукі да патрэб практыкі.

Дацэнт Д. Е. ФАКТАРОВІЧ.

ПАШЫРЫЦЬ СУВЯЗЬ СТУДЭНТАЎ СА ШКОЛАЙ

Пытанне, пастауленае на абмеркаванне рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт», вельмі важнае. Большасць выпускнікоу пасля сканчэння універсітэта пойдуць на работу у сярэднюю школу. Да гэтай адказнай работы па выхаванню і навучанню нашага падрастаючага пакалення яны павінны быць усебакова падрыхтаваны у сценах БДУ.

Такія прадметы, як педагогіка, прыватная методыка і педпрактыка павінны заняць належнае месца у вучэбным плане універсітэта і праводзіцца высокакваліфікаванымі, добра знаёмымі з вучэбным працэсам сярэдняй школы спецыялістамі. Універсітэту неабходна арганізаваць базавыя школы для правядзення педпрактыкі студэнтаў, забяспечыўшы іх кабінеты усімі неабходнымі прыборамі і абсталяваннем. Студэнтам, праходзячым педпрактыку у школе, трэба бачыць, як павінна быць пастаулена выкладанне данага прадмета у школе, пазнаёміцца з поўным камплектам абсталявання школьных кабінетаў, правядзеннем лабараторных работ, работамі ў майстэрнях, на прышкольным вопытным участку і г. д.

Трэба адзначыць, што ні адна з школ г. Мінска на сённяшні дзень не можа поунасцю адказваць усім патрабаванням, якія неабходны для поўнага забеспячэння вучэбнага працэсу на сучасным узроуні, тым больш для правядзення высокакваліфікаванай педагагічнай практыкі студэнтаў. Задачай універсітэта павінна быць аказанне дапамогі як матэрыяльнымі сродкамі, так і метадычнай дапамогай у арганізацыі кабінетаў, майстэрань і доследных участкаў школ. Да такой работы, безумоўна, павінны быць прыцягнуты студэнты і супрацоунікі універсітэта. Студэнты павінны арганізаваць пазакласную работу з навучэнцамі.

Безумоўна, неабходна шырэй арганізаваць сувязь студэнтаў са школай, не абмяжоўвацца толькі часам педпрактыкі. Пасля праходжання педпрактыкі пажадана замацаваць гэтых студэнтаў за школай для работы да канца навучання ва універсітэце. Гэта дапаможа ім лепш азнаёміцца са школай і той работай, якая прадстаіць ім у будучым. Вельмі важна, каб у якасці сваіх курсавых і дыпломных работ яны брали таксама тэмы метадычнага характару, звязаныя з арганізацыяй і правядзеннем класнай і пазакласнай работы ў школе, методыцы складання асобных тэм вучэбнага плана сярэдняй школы.

А. КАЧЫНСКІ,
настаўнік фізікі СШ №1.

НАРАДА СТУДЭНЦКАГА АКТЫВУ

Днямі адбылася нарада прафоргаў, групоргаў і стараст груп, прысвечаная пытанням палітыка-выхаваўчай работы.

У сваім дакладзе рэктар універсітэта К. І. Лукашоў адзначыу, што за апошнія гады БДУ стаў буйным цэнтрам падрыхтоукі спецыялістаў і навуковых кадраў. Спыніўшыся на палітыка-выхаваўчай рабоце ва універсітэце, К. І. Лукашоў сказаў, што комсамольская і профсаюзная арганізацыі не ўдзяляюць гэтаму важнаму пытанню сур'ёзнай увагі.

За апошні час назіраецца паслабленне дысцыпліны некаторых студэнтаў універсітэта. Многа пропускаў лекцый, сустракаюцца выпадкі амаральных учынкаў студэнтаў. Парушэнне норм паводзін прыводзіць да таго, што некаторых студэнтаў прыходзіцца выключаць з універсітэта.

У спрэчках выступіў старшыня профбюро фізмата А. Аусіевіч. Ён сказаў, што лабараторыі факультэта знаходзяцца ў незадавальняючым становішчы. Многія прыборы устарэлі і не даюць магчымасці праводзіць лабараторныя работы. Часам нехапае прэпаратаў.

У спрэчках таксама выступілі сакратар партыйнага камітэта В. І. Старавойтаў, Г. Герасіменка, студэнт IV курса гістфака, і другія.

На нарадзе было прынята разгорнутае рашэнне, накіраванае на ліквідацыю адзначаных недахопаў у рабоце комсамольскіх і профсаюзных арганізацый.

Ю. НІКАЛАЕЎ.

ДНІ, ПРАВЕДЗЕННЫЯ Ў ШКОЛЕ

16 студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ улілося у калектыу настаунікаў 33 школы для праходжання педагагічнай практыкі. Усе бакі жыцця школы цікавілі будучых спецыялістаў. Ужо на наступны дзень некаторыя з іх не без задавальнення адзелі на руку чырвоныя павязкі з надпісам «Дзяжурны настаунік» і забяспечвалі парадак на перапынках у калідорах школы; другія знаёміліся з планамі класных кіраунікоу, складалі для сябе планы выхаваучай работы на месячны тэрмін знаходжання у ролі класных кіраунікоу; трэція абмяркоувалі са старшай піонерважатай, як правесці чарговы збор піонерскага атрада.

Студэнтка Бажэнава давала урок першая. 14 сакавіка з класным журналам, картай і указкай у руках увайшла яна у 7-ы клас, дзе акрамя калектыва навучэнцаў удзельнічалі яе таварышы, выкладчык і вядучы практыку метадыст. З вялікай цяжкасцю, пераадольваючы хваляванне, праводзіць будучая настауніца свой урок. Старанна прадуманы усе часткі урока, глыбока вывучан матэрыял па тэме. Увага навучэнцаў і цішыня, якія устанавіліся у самым пачатку урока, перарываецца званком. Урок закончан. Але маладая настауніца яшчэ хвалюецца. Больш спакойна і упэунена праводзіць яна наступныя урокі.

Урокі другіх таварышаў праходзяць не з меншай цікавасцю. Кожны уносіць ва урок нешта новае, сваё. Вось Гадун дае урок у 8-м класе. Абдумана кожнае слова, кожнае дзеянне. Змястоунае, цікавае выкладанне матэрыяла суправаджаецца паказам на карце, схематычным паказам магчымага на дошцы.

А вось Дзерч, у яго вялікі багаж ведаў. Яму хочацца расказаць многа, ён незадаволены, што яго абмяжоуваюць 45-мінутамі урока і 13—14-гадовым узростам навучэнцаў. Ён прыстасоуваецца да узроставага развіцця навучэнцаў і некалькі своеасабліва, але поуна і цікава раскрывае перад навучэнцамі 7 класа складаныя гістарычныя паняцці і падзеі позняга сярэдневякоуя.

«Як ён добра тлумачыу»,—чуецца сярод навучэнцаў пасля яго урока. Трэба аддаць справядлівасць, што усе студэнты, маючы належны багаж ведаў, добрасумленна рыхтаваліся да кожнага урока, прадумвалі методыку правядзення урока, выкарыстоувалі мастацкую літаратуру, творы класікаў марксізма-ленінізма, дакументальны матэрыял, умела карысталіся наглядными дапаможнікамі

Студэнты БДУ паказалі не толькі высокую тэарэтычную падрыхтоуку і добрае правядзенне практычных урокаў, яны зарэкамендавалі сябе і добрымі выхавацелямі, дапамаглі класным кіраунікам у правядзенні выхаваучых мерапрыемстваў.

Тт. Цаплева і Буглак правялі цікавую экскурсію у музей археалогіі пры Акадэміі навук БССР.

А. Кандыба вялікую дапамогу аказау у правядзенні збору атрада на тэму: «Этих дней не смолкнет слава». Збор быу праведзен у музеі Айчыннай вайны .Незвычайная дружба устанавілася у яго з рэбятамі 5-га класа, дзе ён быу прымацаваны класным кіраўніком. Дапамог Кандыба падрыхтаваць і парвесці піонерскі збор на тэму: «Дети разных народов, мы мечтою о мире живем».

Пажадаем будучым настаунікам таксама добрасумленна адносіцца да педагагічнай работы у школах, у якія пападуць яны пасля сканчэння універсітэта.

А. ПАНАМАРОВА,
выкладчыца гісторыі 33-й школы.

У НАШЫХ ДЫПЛАМАНТАЎ

Для напісання дыпломнай работы згодна вучэбнага плана адводзіцца дзесяты семестр. Але для таго, каб студэнт змог своечасова яе напісаць, патрэбна вялікая падрыхтоука як з боку кіраунікоу, так і з боку саміх студэнтаў.

Практыка гаворыць, што нанлепш справы абстаяць у тых, хто у аснову дыпломнай паклаў тэму, узятую яшчэ на папярэдніх курсах. Гэты метад выкарыстоуваюць многія студэнты гістарычнага факультэта. Так, у групе, якой кіруе дацэнт Фрыдман, большасць дыпломных работ вырасла з курсавых.

Студэнтка гэтага факультэта М. Зубцова тэму сваёй дыпломнай работы «Дзекабрысты аб сялянскім пытанні ў Расіі» аблюбавала яшчэ з другога курса, а на трэцім курсе яна працавала над ёй у навукова-даследчым гуртку. Але ў свой час М. Зубцова асвятляла гэтую тэму больш вузка: калі раней яна закранала пытанне аб поглядах дзекабрыстаў Поуднёвага таварыства, то цяпер работа ахапляе пытанні як дзейнасці Поуднёвага, так і Поуночнага таварыстваў.

Большасць студэнтаў групы здала на праверку па 2—3 раздзелы сваіх работ, а студэнты Баранаў і Петрыкаў поунасцю закончылі напісанне дыпломных.

Работа П. Петрыкава «Гістарычныя погляды Н. Г. Чэрнышэўскага» атрымала высокую ацэнку кіраўніка дац. Фрыдман. Кіраунік адзначае у ёй правільны, глыбокі падыход да асвятлення пастаўленага пытання. Цікава адзначыць і тое, што тэма, узятая П. Петрыкавым, мала распрацавана нашымі даследчыкамі. Па ёй надрукаваны толькі адзін артыкул тав. Ілірэцкага ў часопісе «Вопросы истории». П. Петрыкаў самастойна даследваў матэрыял, смела выказаў свае думкі і меркаванні, якія абвяргаюць некаторыя палажэнні, адзначаныя тав. Ілірэцкім.

Дыпломная П. Петрыкава, гаворыць дац. Фрыдман, мае значэнне самастойнага даследвання у галіне вывучэння гістарычных поглядаў Н. Г. Чэрнышэускага.

Добрым вынікам работы П. Петрыкава з'явілася тое, што над абранай тэмай ён пачаў працаваць яшчэ з чацвертага курса. Работа зараз поунасцю закончана. Закончылі напісанне дыпломных і студэнты Я. Рапановіч (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры), Крачкоуская (аддзяленне журналістыкі) і іншыя.

Многія работы будучых выпускнікоу нашага універсітэта маюць вялікае практычнае значэнне. Некаторыя з іх вырашаюць праблемы, звязаныя з пытаннямі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Студэнтка біёлага-глебавага факультэта Макарэвіч у працэсе падрыхтоукі матэрыялаў для будучай работы, наперакор пануючай думцы, быццам у возеры Нарач водзяцца дзве формы акуня—берагавога і глыбіннага — устанавіла, што ў Нарачы жыве толькі адна форма акуня. Раней лічылася, што берагавы акунь як дробная рыба толькі засмячае воды Нарачы, пагэтаму яго і трэба вылоуліваць, а глыбіннага акуня можна лавіць толькі ў невялікай колькасці.

Макарэвіч абвергла існаваўшую думку і даказала, што так званы «берагавы» акунь—гэта тойжа акунь, што водзіцца і ў глыбінных водах, толькі ён да пэўнага узросту жыве у берагах возера. Пагэтаму бязлітаснае вылоўліванне дробнага акуня магло-б прывесці да пагражаючага становішча з запасамі гэтай каштоунай рыбы.

Вялікае значэнне маюць і дыпломныя праектаванні студэнтаў аддзялення геалогіі. Будучыя геолагі працуюць на матэрыялах, сабраных у час праддыпломнай практыкі у пошукавых і разведачных групах.

Абарона дыпломных работ на большасці факультэтаў пачнецца у красавіку месяцы. Пагэтаму недапушчальна, каб студэнты марудзілі з напісаннем іх. Нажаль, трэба здзіуляцца, што сярод пяцікурснікаў ёсць такія студэнты, якія па сённяшні дзень усё яшчэ знаходзяцца у стадыі «раскачкі», чакаюць, як кажуць, з мора пагоды.

У свой час Г. Зотаў запэуніу свайго кіраўніка дацэнта М. С. Зярніцкага, што абраная ім тэма «Газета «Правда» аб абароне сацыялістычнай Айчыны (1918 г.)» яму падабаецца. Сапрауды, тэма цікавая, але і у той-жа час яна цяжкая. Над такой тэмай Г. Зотаў павінен быу працаваць настойліва, упарта. На вялікі жаль, Г. Зотаў марудна працуе над абранай тэмай і на сённяшні дзень не здаў на прагляд ніводнага раздзелу.

Сур'ёзнае апасенне выклікае і студэнт гістфака Б. Сакалоў, які перамяніў некалькі тэм сваёй работы, у выніку чаго ім не прадстаўлена на прагляд ніводнага раздзелу.

Г. Зотаў, Б. Сакалоў і іншыя, якія адкладваюць напісанне дыпломных, павінны у бліжэйшы час прыступіць да работы, каб своечасова закончыць напісанне ўсіх раздзелаў і аддаць іх на прагляд замацаваным за імі кіраўнікам.

У тым, што некаторыя студэнты зацягнулі напісанне дыпломных работ, вінаваты і комсамольскія бюро курсаў, якія не займаліся сваімі таварышамі, не аказалі ім неабходнай дапамогі.

Абарона дыпломных работ не за гарамі. Застаўшыйся час трэба размеркаваць так, каб не паўтарылася гісторыя мінулых год, калі асобныя студэнты, марудзячы са здачай дыпломных работ, заканчвалі іх наспех, перад самай абаронай.

Т. БАНЬКОЎСКАЯ,
Б. МАНЦЭВІЧ.

ПІСЬМО Ў РЭДАКЦЫЮ

Яшчэ раз аб сталовай

2 гадзіны дня. Абедзенны час. У сталовай БДУ поўна людзей.

— Што-небудзь з бульбяным гарнірам ёсць?

— Няма.

— Вінегрэт ёсць?

— Няма.

— Аладкі ёсць?

— Няма.

— Кофе ёсць, мабыць?

— Што вы, няма.

— А траска ёсць?

— Вы-ж бачыце, што няма!

Прастаяушы з поугадзіны у адной чарзе—каля буфета, і нарэшце, выбіўшы чэкі, становішся у другую, такую-ж чаргу каля кухні. Здавалася-б, што самаабслугоуванне будзе эканоміць час студэнта, а атрымліваецца іншае—і лішняя мітусня, і часу траціцца шмат. А усё гэта таму, што загадзя не падрыхтоуваецца адпаведная колькасць блюд, а робіцца усё экспромтам. Адбіваецца гэта, безумоуна, і на якасці стравы.

Няма ў сталовай і належнай чысціні. Позна яна пачынае работу і вельмі рана закрываецца. Па сутнасці справы, тут можна толькі абедаць. Хацелася-б, каб сталовая пачала працаваць лепш, каб было больш поуным меню, і лепшым абслугоуванне.

А. ВЯРЦІНСКІ.

Навукова-даследчая работа студэнтаў

Пытанне аб навукова-даследчай рабоце студэнтаў ВНУ неаднаразова узнімалася у нашым друку. Зауважыць будучага вучонага, здольнага да глыбокай творчай работы, падтрымаць яго, аказаць усямернае садзеянне яго росту можна і трэба яшчэ у студэнцкія гады.

Важна, каб нашы выпускнікі сталі не толькі добрымі педагогамі па гісторыі, літаратуры, фізіцы, матэматыцы і іншых дысцыплінах, але као многія з іх імкнуліся рухаць навуку уперад. Для гэтага яны павінны атрымаць добрую загартоўку у ВНУ.

Узняцце узроўня навукова-даследчай работы студэнтаў у значнай ступені звязаны з яе арганізацыяй.

Часта аб паспяховым кіраўніцтве даследчай работы студэнтаў мяркуюць па колькасці праведзеных пасяджэнняў навуковага гуртка, па ліку прачытаных там рэфератаў.

Мне уяўляецца такі падыход зусім няправільным. Даследчы падыход праяўляецца у здольнага студэнта ва усім комплексе яго вучэбнай работы у ВНУ: у рэфераце на семінары і спецсеміна-рах, у курсавой і дыпломнай работах, у дакладах на тэарэтычных канферэнцыях і г. д. Таму задача прафесараў і дацэнтаў глыбей вывучаць самастойную работу студэнтаў, з тым каб своечасова выявіць, часам нават у зародку, і развіваць творчыя здольнасці таго або іншага студэнта на працягу усіх год яго вучобы.

Прывяду некалькі прыкладаў з практыкі даследчай работы студэнтаў па гісторыі СССР. Былы студэнт гістфака тав. Міронаў (цяпер кандыдат гістарычных навук) яшчэ у час вучобы на другім курсе зрабіў цікавае паведамленне аб дэкабрысцкім таварыстве «Аб'яднаных славян», на трэцім курсе ён пісаў курсавую работу па адной з тэм аб руху дзекабрыстаў, а па чацвертым курсе ён прадставіў арыгінальную работу на тэму: «Дзекабрысты у Сібіры». Гэтая работа была адзначана Міністэрствам вышэйшай адукацыі. Былая студэнтка тав. Герман на другім курсе зрабіла цікавы даклад на практычных занятках аб аграрных адносінах у Расіі ў канцы XIX веку, на трэцім курсе яна пісала курсавую работу па блізкай тэме «Сялянскі рух у Мінскай губерні ў 1905—1907 гг.». Студэнтка Герман прадаўжала працаваць над сваёй тэмай на IV курсе і на пятым прадставіла арыгінальную работу «Рэволюцыйны рух рабочых і сялян Мінскай губерні у 1905—1907 гг.», выкарыстаўшы для яе напісання значную колькасць неапублікаваных архіўных дакументаў Мінскага абласнога архіва. Работа тав. Герман была аднесена на гарадскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ да першай катэгорыі і цяпер яна друкуецца у зборніку студэнцкіх навуковых работ. Станоўчыя ацэнкі на гарадскім аглядзе студэнцкіх навуковых работ атрымалі таксама работы былых студэнтаў гістфака Андрыянава, Мялешкі, Белькіна, Ігнаценкі і раду іншых, якія пачыналі працаваць над сваімі тэмамі на малодшых курсах на практычных і семінарскіх занятках.

У бягучым годзе значная частка студэнтаў IV курса гістфака на спецсемінары па гісторыі СССР працавала па тэмах, прысвечаных другому этапу вызваленчага руху у Расіі—рэволюцыйна-дэмакратычнаму. Значная ўвага была удзелена вывучэнню новых матэрыялаў (Пражская і Сафиская калекцыі) аб А. І. Герцане і Н. П. Огарове, апублікаваных у «Литературном наследстве» №№ 61 і 62. Змястоўныя далады зрабілі студэнты Бажэнава і Салашэнка—«Новыя матэрыялы аб рэволюцыйнай сітуацыі у Расіі (у 1859—1861 гг.)», Герасіменка—«Рускія рэволюцыйныя дэмакраты і польскае паўстанне 1863 г.», Гадуноў—«Герцан у Лондане — стваральнік вольнага рускага друку», Хількевіч—«Герцэн і яго «Пісьмы да старога таварыша», Пружанкова—«Новыя матэрыялы аб Огарове», Садоўскі—«Н. Г. Чэрнышэўскі у «Современнике» і інш. Гэтыя студэнты, улічыўшы зацікаўленасць кіраўніка і таварышаў, пасля дадатковай апрацоўкі прадставяць цікавыя работы на гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ. Сур'ёзна працуюць над дыпломнымі работамі студэнты V курса тт. Петрыкаў, Баранаў, Панюцін, Зубцова, Камароў і іншыя. Вынікам іх працы таксама будуць арыгінальныя работы.

Сур'ёзную даследчую работу вядуць дзесяткі студэнтаў гістарычнага факультэта. Але мне здаецца, што такіх студэнтаў было-б значна больш пры уважлівых адносінах усіх навуковых работнікаў да самастойнай творчай работы студэнтаў.

М. ФРЫДМАН,
дацэнт.

Так нараджаецца аўтарытэт

У прасторным, ярка асветленым класе 2-й Чырвонабярэжскай школы сабраліся дзесяцікласнікі на традыцыйны вечар сустрэчы з выпускнікамі школы. У гэты марозны, зімні дзень было сказана многа цёплых слоў аб Радзіме, аб школе, аб любімых настаўніках.

Да трыбуны падыходзіць высокая, стройная дзяўчына з пышнымі русымі валасамі. Гэта актывістка і адна з лепшых навучэнцаў школы—Антаніна Навакоуская.

— Мы апраудаем давер'е нашых старэйшых таварышаў, давер'е партыі, якія чакаюць ад нас добрай вучобы,—усхвалявана гаворыць Антаніна.

Гэта было два гады назад... Антаніна Навакоуская скончыла школу з сярэбраным медалем і паступіла ва універсітэт на біялагічны факультэт. Зараз яна займаецца на другім курсе. Чулая, сумленная, прынцыповая, Антаніна хутка заваявала павагу сваіх таварышаў па факультэту.

На першым курсе Антаніну выбралі членам профбюро і даручылі ёй жыллёва-бытавы сектар. Дзяўчына з вялікім жаданнем узялася за работу. Як жывуць студэнты, хто мае патрэбу у дапамозе? Антаніна знаёмілася з жыццём таварышаў, дапамагаючы кожнаму, каму была патрэбна таварыская дапамога або парада.

Чым больш пазнавалі Антаніну, тым больш паважалі яе за правільнае разуменне дружбы, за добра развітае пачуццё таварыскасці. Тоня не мірыцца з дрэннымі учынкамі некаторых студэнтаў. Яна ведае, што своечасова указаць студэнту на памылку—гэта самая лепшая дапамога.

На II курсе Антаніну выбралі старшынёй профбюро. У Антаніны многа клопатаў: даць путёўку студэнтцы, якой патрэбна ўмацаваць здароуе, паставіць студэнта на дыэтычнае харчаванне, дапамагчы маючым патрэбу студэнтам атрымаць інтэрнат. А як лепш арганізаваць адпачынак студэнтаў? Аб усім думае Антаніна Навакоўская.

«Я хачу пайсці вучыцца на вячэрнія курсы культмасавікоу,—гаворыць яна.—Умець арганізаваць моладзь—гэта патрэбна будзе мне і цяпер і пасля заканчэння універсітэта».

Займаючыся грамадскай работай, не забывае Антаніна Навакоуская і аб вучобе. Яна добра вучыцца. Антаніна любіць сваю спецыяльнасць і імкнецца глыбей вывучыць тое, што неабходна ёй для работы. А неабходна ведаць вельмі многае. Тоня мала думае аб тым, дзе ёй давядзецца працаваць. Дзе будзе месца яе работы—на цалінных землях Казахстана, Алтая або у адной з вёсак Беларусі—для Тоні усёроуна. Прыносіць карысць сваёй працай, быць карыснай людзям—вось аб чым думае Антаніна.

Над горадам апусціуся вечар. Ціха у інтэрнаце пасля працоунага дня. Тоня схілілася над гісторыяй партыі. Шалясцяць старонкі. Заутра семінар па асновах марксізма-ленінізма. Многа трэба яшчэ зрабіць, каб быць добрай падрыхтаванай.

І Тоня зробіць усё.

Н. ДАРАШЭНКА.

У ЗААЛАГІЧНЫМ МУЗЕІ

З кожным годам расце і папауняецца экспанатамі заалагічны музей універсітэта. Ён быу створан у 1923 годзе па ініцыятыве партыйнай арганізацыі, рэктарата і аддзялення біялогіі універсітэта.

Асновай для стварэння музея паслужылі матэрыялы, сабраныя супрацоунікамі і студэнтамі аддзялення біялогіі у час экспедыцый па вывучэнню фауны Беларускай ССР, арганізаваных прафесарам А. В. Федзюшыным. Частка матэрыялау і экспанатау, наяуных у музеі, атрымана з заалагічнага музея Ленінградскага дзяржаунага універсітэта і музея пры Маскоускім дзяржауным універсітэце імя М. В. Ламаносава.

У 1940 годзе музей меу ужо тры вялікія залы, дзе размяшчалися яго аддзелы са шматлікімі экспанатамі і калекцыямі.

Нягледзячы на вялікія страты, нанесеныя фашысцкай акупацыяй, музей разам з універсітэтам стаў шпарка адраджацца.

Зараз у музеі створаны 4 аддзелы, у якіх налічваецца звыш 6000 экспанатау і калекцый. Найбольш цікавымі з іх з'яуляюцца калекцыі рыб і птушак, сабраныя супрацоунікамі музея, навуковымі работнікамі і студэнтамі біёлага-глебавага факультэта у ваколіцах азёр Нарачанскай групы, Палескай нізіны і возера Лукамль.

Вялікую цікавасць уяуляе калекцыя мышавідных грызуноу, прадстауленая доктарам біялагічных навук І. Н. Сержаніным пасля заканчэння ім манаграфіі «Млекакормячыя БССР», а таксама калекцыя студэнта IV курса біёлага-глебавага факультэта Ю. Сапажэнкава, сабраная у час паездкі у раёны Сярэдняй Азіі.

У адпаведнасці з мерапрыемствамі студзеньскага Пленума ЦК КПСС па уздыму сельскай гаспадаркі значнае месца у экспазіцыях музея займаюць пытанні барацьбы са шкоднікамі сельскай гаспадаркі.

Такім шкоднікам, як мышавідныя грызуны, адведзены асобныя вітрыны «Крапчаты суслік», «Сыч касманогі і мышавідныя грызуны», «Шкоднікі лясной і сельскай гаспадаркі» і інш. За апошні час музеем змантыраваны 14 новых вітрын на розныя біялагічныя тэмы.

Навуковая работа музея цесна звязана з навуковай работай кафедры заалогіі, якой кіруе прафесар Г. Г. Вінберг. Асноунай тэматыкай кафедры з'яуляецца праблема па рацыяналізацыі рыбнай гаспадаркі рэспублікі.

Выходзячы з дырэктыу XX з'езда КПСС па павелічэнню здабычы рыбы ва унутраных вадаёмах, супрацоунікі музея у апошні час закончылі работу на тэму «Прычыны засмечання вадаёмау малакаштоунымі рыбамі і шляхі узнаулення каштоуных пародаў рыб ва умовах вадаёмау БССР». Выканана таксама работа па зменлівасці і біялагічных асаблівасцях акуня некаторых азёр БССР, у якой разглядаецца уплыу акуня на каштоуныя віды рыб, ад якога у значнай меры залежыць не толькі колькасны састау каштоуных пародаў рыб, але і рыбапрадукцыйнасць вадаёмау рэспублікі.

Вялікае месца у рабоце музея займае экскурсійная і грамадская работа.

З наведвальнікамі музея—студэнтамі, навучэнцамі, рабочымі і служачымі Мінска і рэспублікі праводзяцца экскурсіі, гутаркі, лекцыі на розныя біялагічныя тэмы, як, напрыклад, «Шляхі развіцця жывёльнага свету», «Жывёльны свет БССР і шляхі яго фарміравання», «Паходжанне чалавека», «Зменлівасць і яе прычыны у жывёльным свеце», «Спрэчныя праблемы эвалюцыі», «Шкоднікі сельскай гаспадаркі і барацьба з імі» і іншыя.

За мінулы год музей наведалі і азнаёміліся з яго экспанатамі і экспазіцыямі звыш 700 чалавек-экскурсантаў, не лічачы экскурсантаў-адзіночак.

Многа станоучых водгукаў аб рабоце музея пакінута у кнізе запісаў наведвальнікамі.

Аднак, нягледзячы на значныя дасягненні у рабоце музея, трэба усведамляць, што зроблена яшчэ вельмі мала, асабліва па расшырэнню плошчы і укамплектаванню аддзелаў музея, што з'яуляецца першай і самай неабходнай задачай у бліжэйшы час. У гэтым у першую чаргу павінен дапамагчы рэктарат, вызначыушы музею дадатковую плошчу, а таксама хоць-бы мінімальныя сродкі на набыццё абсталявання і экспанатаў, асабліва з экзотыкі.

Ф. ВАРОНІН.

НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ— НА СЛУЖБУ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ

XX з'езд Комуністычнай партыі Совецкага Саюза паставіу перад совецкімі вучонымі вялікую і адказную задачу: пераўзыйсці ў бліжэйшы час дасягненні навукі за межамі нашай краіны. Вялікая роля навукі у барацьбе за тэхнічны прагрэс. Развіццё тэхнікі базіруецца перш за усё на дасягненнях фізікі, хіміі і іншых галін ведаў. Таму вучоныя павінны быць цесна звязаны з прамысловасцю, укараняючы ў яе новыя навуковыя адкрыцці, чэрпаючы з прамысловасці новыя праблемы і тэмы, вырашэнне якіх будзе садзейнічаць як тэхнічнаму прагрэсу, так і далейшаму развіццю навукі.

Вучоныя хімічнага факультэта працуюць над вырашэннем задач, пастаўленых XX з'ездам у галіне развіцця навукі і тэхнікі. Многія вучоныя нашага факультэта займаюцца вывучэннем законаў сорбцыі і распрацоўкай тэорыі сорбцыённых працэсаў. Гэтая работа мае не толькі навуковае, але і практычнае значэнне. Многія сорбенты, як вугаль, глина і іншыя, знайшлі шырокае выкарыстанне у тэхналогіі ачысткі тлушчаў, маслаў, антыбіётыкаў і многіх іншых харчовых і нехарчовых прадуктаў. Перад вучонымі стаяла задача стварэння высокаактыуных адсорбентаў з мясцовай сыравіны.

Даследаваннямі прафесара Н. Ф. Ярмоленкі і яго супрацоунікаў паказана, што такія адсорбенты могуць быць атрыманы з мясцовай сыравіны—торфу. Нашы вучоныя разам з супрацоунікамі завода медпрэпаратаў і супрацоунікамі інстытута хіміі АН БССР распрацавалі новы, вельмі эфектыуны метад ачысткі пеніцыліна, атрымліваемага на заводах медпрэпаратаў. Па распрацаванаму імі метаду працуюць Мінскі і Кіеускі заводы.

Важнае значэнне мае і пытанне выкарыстання беларускіх глін у якасці сорбентаў. Супрацоунікамі кафедры аналітычнай хіміі разам з работнікамі трактарнага завода даказана, што некаторыя беларускія гліны могуць быць паспяхова выкарыстаны для ачысткі адпрацаваных мінеральных масел. Атрыманыя даныя дазволяць прывазную сыравіну замяніць мясцовай і павысіць каэфіцыент выкарыстання масел. Важныя даследаванні, якія пакуль што уяуляюць тэарэтычны інтарэс, праведзены Г. Л. Старобінцам па вывучэнню сорбцыі каучука з розных асяроддзяу растваральнікаў. Ім устаноулены цікавыя законамернасці, звязаныя з выбарчай сорбцыйнай здольнасцю каучука. Даследаванні ў гэтым напрамку абагулены ў доктарскай дысертацыі Г. Л. Старобінца, якую ён паспяхова абараніў. Над пытаннем выкарыстання сорбцыённых працэсаў для вырашэння практычна важных задач працаваў прафесар Ф. Г. Асіпенка. Ім паказана магчымасць раздзелу бітумаў торфа хроматаграфічным метадам і выдзялення з іх вуглевадародаў складаных эфірафоскаў, тлушчаў і г. д.

Вялікае значэнне мае таксама работа па хімічнаму фасанірванню скуры, выкананая прафесарам Ф. Г. Асіпенка са студэнтамі. Праведзеныя даследаванні дазволілі замяніць цяжкую ручную працу па фасанірванню механізаванай апрацоукай. Мінскі кожзавод ужо часткова укараніу гэты метад.

Другая важная праблема, над якой працуюць навуковыя работнікі хімфака—акісленне арганічных рэчываў. Супрацоўнікамі і аспірантамі кафедры каталіза, якую ўзначальвае праф. Б. В. Ерафееу, паказана, што акісленне ў прысутнасці ініцыятараў, працякае з утварэннем гідраперакісей, якія могуць знайсці сабе ужыванне у прамысловасці пластмас і г. д. Акісленне непрэдзельных злучэнняў тыпу кетонаў перакіссю вадарода з мэтай атрымання рэакцыйна-здольных моно- і дзіокісей кетонаў прысвечаны даследаванні дац. І. Г. Цішчанкі. Атрыманыя прадукты маюць значэнне для распрацоукі новых метадаў арганічнага сінтэза, а таксама могуць быць выкарыстаны ў якасці фізіялагічных актыўных рэчываў.

На кафедры фізічнай і калоіднай хіміі праводзіцца значная работа па акісленню цэлюлозы двувокісам азота. Атрыманы пры гэтым прадукт валодае крывеспыняючымі уласцівасцямі і знаходзіць ужыванне ў медыцыне пры хірургічных аперацыях, а таксама у папяровай і тэкстыльнай прамысловасці.

Кафедра цяпер працуе над пытаннем будаўніцтва доследнай устаноўкі па атрыманню монакарбаксіл цэлюлозы. Атрыманне гэтага прадукта на доследнай устаноўцы дазволіць у шырокіх маштабах вывучыць выкарыстанне яго ў розных галінах народнай гаспадаркі.

Апошняя, трэцяя праблема, якая распрацоўваецца супрацоунікамі кафедр фізхіміі і каталіза, прысвечана вывучэнню кінетыкі гетэрагенных хімічных рэакцый, што працякаюць з удзелам цвёрдых цел. Пытанні, якія ўваходзяць у даную праблему, маюць важнае практычнае значэнне. Да ліку адносяцца такія пытанні, як карозія металаў, атрыманне будаўнічых матэрыялаў, металу і г. д.

Да цыклу гэтых работ адносяцца даследаванні сульфідырання стальных і чыгунных вырабаў, а таксама азацірванне сталі. Як той, так і другі працэс, а таксама разам узятыя, павышаюць зносаустойлівасць стальных і чыгунных вырабаў у некалькі разоў. Так, напрыклад, пасля серанасычэння паверхні стальных вырабаў знос, як намі паказана, змяншаецца у 2--3 разы, для чыгунных вырабаў--у 5—7 разоў. Сульфідырванне і азацірванне змяншаюць знос сталі ў 20—30 разоў, а чыгуна—у 50—100 разоў. Атрыманыя вынікі маюць несумненна важнае значэнне для машынабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці, так як яны дазваляюць павялічыць тэрмін службы дэталяў машын.

Даследаванні, праведзеныя на кафедры, дазволілі распрацаваць рад метадаў серанасычэння, рэкамендаваных машынабудаўнічым заводам г. Мінска.

Навуковыя працы і даследаванні работнікаў хімфака друкуюцца як у Вучоных запісках універсітэта, так і ў часопісах АН БССР. За прайшоўшыя чатыры гады супрацоўнікі факультэта надрукавалі больш 80 работ і абаранілі дзве доктарскія дысертацыі.

Прафесар М. ПАЎЛЮЧЭНКА,
загадчык кафедры фізічнай хіміі.

ХТО ВІНАВАТЫ?

Хімічны корпус. Дастаткова увайсці у яго, каб вы адчулі самыя «прыемныя» пахі. Вы стараецеся хутчэй зрабіць усё неабходнае, што вам тут трэба і з палёгкай выходзіце на свежае паветра... Мімаволі уздыхнуушы, вы спачуваеце студэнтам хімічнага факультэта, выкладчыкам, лабарантам, якім кожны дзень прыходзіцца паглынаць пахі усялякіх газаў, далека непрыемных, і можна сказаць —шкодных.

Гэта-ж не дзіва, што іншы раз, праходзячы каля якой-небудзь лабараторыі, стараешся проста праскочыць, як кажуць, каля яе. Нейкі студэнт ці студэнтка, набраушыся мужнасці, праводзіць практычны дослед, і каб самому не стаць ахвяраи гэтага доследу, мабыць, пагэтаму шырока расчыніу дзверы. Клубы белага, жоутага дыму, не спяшаючыся, выплываюць у калідор.

На вялікі жаль, склаўшаяся абстаноука на факультэце існуе не першы год. А канкрэтных мераірыемстваў па ухіленню гэтай шкоднай з'явы у лабараторыях ніхто з кіраўніцтва профбюро хімічнага факультэта (старшыня Старобінец), ні з гаспадарчай часткі універсітэта не прымаў. Яны, відаць, сапрауды мяркуюць, што навука патрабуе ахвяр...

Наогул, профбюро хімічнага факультэта забыла, што уся яго работа павінна быць накіравана на ахову працы, на стварэине неабходных умоу студэнтаў, якія займаюцца у лабараторыях. Зроблена-ж зусім мала.

Не ва усіх лабараторыях можна знайсці аптэчкі, інструкцыі па ахове працы не вывешаны. Зусім не дзейнічае, або проста адсутнічае вентыляцыя, якая-б выцягвала шкодныя пары і газы. Адсюль вечны смурод і дым у лабараторыях і калідорах.

Адсутнічаюць у лабараторыях на выпадак пажару і коудры, у той час, як тушэнне агню імі прызнана самым дзейсным сродкам. А дастаць іх і забяспечыць імі лабараторыі наурад ці з'яуляецца цяжкасцю. Для гэтага могуць быць выкарыстаны старыя коудры, спісаныя гаспадарчай часткай у студэнцкіх інтэрнатах. Толькі безадказнымі адносінамі да справы можна вытлумачваць апрауданне недахопау профсаюзным бюро хімічнага факультэта. Там спадзяюцца, што гэтым пытаннем павінна займацца толькі адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта і сам прарэктар тав. Бярэзін.

Як кажуць, Іван ківае на Пятра, а справа далей слоу не ідзе. Ясна толькі тое, што ні профсаюзнае бюро хімфака, ні гаспадарчая частка нічога не робяць, каб выправіць становішча.

Толькі гэтым можна растлумачыць тое, што у шклодуунай майстэрні хімічнага факультэта забылі стварыць самыя неабходныя умовы для працы рабочых. Як не дзіуна, але тут вентыляцыя не працуе. Можа таварышы Старобінец і Бярэзін лічаць, што яна і не патрэбна тут: халоднае паветра без усялякіх перашкод шыбуе праз разбітае шкло акна, і дзірку у падаконніку? Але-ж гэта называецца скразняком, дарагія таварышы, і рабочыя майстэрні вымушаны працаваць з небяспекай для свайго здароуя.

Зусім не меншай пагрозай з'яуляецца і не агарожаны рухавік, каля якога кожны дзень ходзяць студэнты. Само сабой узнікае пытанне, хто павінен займацца усім гэтым: профсаюзнае бюро хімічнага факультэта ці гаспадарчая частка на чале з тав. Бярэзіным? Нам здаецца і тое і другое. Застаецца толькі спытаць, хто-ж больш вінаваты?

В. ЛАБАДО.

ВЕЧАР, ПРЫСВЕЧАНЫ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЕ

Нядауна у актавай зале юрыдычнага факультэта было надзвычай ажыулена. Тут праходзіу агульнауніверсітэцкі вечар, прысвечаны дню Парыжскай Комуны.

З дакладам аб важных падзеях у гісторыі руху рабочага класа усяго свету, няуміручай справе Парыжскай Комуны выступіу парторг гістфака кандыдат гістарычных навук Л. М. Шнеерсон.

Затым дацэнт Д. Е. Фактаровіч расказау аб тым уплыве, які аказалі гістарычныя падзеі Парыжскай Комуны на развіццё заходнееурапейскай літаратуры.

Пасля урачыстай часткі вечара быу дадзен канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Вялікім поспехам у гледачоу карысталіся выступленні танцавальнага калектыву, які выканаў некалькі народных танцаў.

І. СЯРГЕЕУ.

РЫХТУЕМ КУРСАВЫЯ РАБОТЫ

Падрыхтоуку курсавой работы мы пачалі яшчэ задоуга да тэрміну яе здачы—на 2-м курсе, зімой. Тэмай яе выбралі адну з актуальных сучасных праблем—«Уплыу дадатковага асвятлення на накапленне пігментаў у лісцях гуркоу і вялічыню пластыд».

Павышэнне ўраджаю і яго хуткае атрыманне—асноуная задача аграбіялагічнай навукі. Таму тэматыка нашых курсавых работ вельмі зацікавіла нас. Нам прадстаяла лабараторная работа — колькаснае вызначэнне пігментаў у сабраным ужо матэрыяле—лістах раслін, вырашчаных ва ўмовах закрытага грунту пры дадатковым асвятленні.

Методыка вызначэнняў даволі вялікая, займае многа часу і патрабуе вялікай стараннасці. Але нас гэта не спалохала. Пасля лекцый мы на працягу 2-х месяцаў заставаліся на 4—6 гадзін на кафедры і рабілі аналізы. У выніку мы яшчэ на 2-м курсе мелі лікавыя даныя для курсавой работы. Засталося толькі літаратурна апрацаваць, што мы і зрабілі у перыяд летніх канікул. Намі было прачытана многа літаратуры, якая датычыцца нашай тэмы.

Хочацца пажадаць студэнтам малодшых курсаў, якім трэба пісаць курсавыя, асабліва, калі яны звязаны з лабараторнымі даследаваннямі, не адкладваць у доўгую скрыню, а ўжо зараней выбіраць тэмы і пачынаць работу, каб не давялося выконваць курсавую работу наспех.

Н. ЦАПАЕВА,
К. ПРЭДКЕЛЬ,
студэнты III курса біяфака,
аддзялення біялогіі.

* * *

Многія студэнты першага курса аддзялення журналістыкі ўжо закончылі курсавыя работы. Сярод іх Аляксандр Шчасновіч, Ленна Шуман, Лілія Суворава, Аустра Роніс і другія. У іх работах адчуваецца самастойнасць, відаць, што студэнты сур'ёзна папрацавалі над імі.

Заканчваюць пісаць курсавыя работы Пётр Казачонак, Ірына Угальнік і другія.

Я. ГОМАН.

Дыспут па раману К. Брандыса

Ва універсітэце адбыуся дыспут па раману сучаснага польскага пісьменніка К. Брандыса «Грамадзяне»—аднаго з лепшых твораў аб сягоняшнім дні польскага народа, яго самаадданай працы, аб станауленні новага чалавека і барацьбе супраць ворагау.

Выступаючы І. Шуцік, студэнт 2-га курса аддз. журналістыкі, адзначыу сугучнасць узятых тэм і вобразаў з нашым штодзённым жыццём і падрабязна спыніуся на раскрыцці вобраза Міхаіла Кузьнара.

Выступіушыя ў спрэчках студэнты Балаш, Нікіфаровіч гаварылі аб жыццёва пераканаучых і запамінальных вобразах моладзі новай Польшчы: Паула Чыжа, Агнешкі, Бронкі, а таксама аб адмоуных персанажах. Спрэчкі разгарэліся вакол вобраза інжынера Шэлінга. Адзначаліся і недахопы рамана.

Наогул раман Казімежа Брандыса «Грамадзяне» пакінуу у студэнтау уражанне цікавага і запамінальнага твору.

П. КАЗАЧОНАК.

ПРАГУЧЭЎ АПОШНІ ЗВАНОК...

Па біякорпусу звонкай хваляй разліуся яшчэ адзін званок. У студэнтау філфака апошні перапынак, а там і апошні час лекцый.

— Сёння у нас вечар дружбы, вечар адпачынку, — неслася у многагалосым шуме па калідорах сярод вышаўшых з аудыторый адпачыць і тут-жа раз-по-раз мільгалі заклапочаныя твары трэцякурснікаў аддзялення журналістыкі Анатоля Геруса, Нікалая Бандарэнкі і студэнткі другога курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Ады Жураўскай.

— Ну, як рэпетыравалі? Усё падрыхтавана? Значыць, ты танцуеш? — у апошні раз пераправяралі арганізатары вечара ўдзельнікаў мастацкай часткі і, атрымаўшы задавальняючы адказ, радасныя беглі далей.

Закончыліся лекцыі. Праз некаторы час 58 аудыторыю запоўнілі другакурснікі аддзялення рускай мовы і літаратуры і студэнты трэцяга курса аддзялення журналістыкі.

На вечар дружбы студэнтаў прышлі і выкладчыкі: Іосіф Васільевіч Зазека і Ніна Нікалаеуна Багалюбава. Толя Герус прачытаў даклад аб дружбе і каханні. Ён правільна абгрунтаваў паняцці «дружба» і «каханне», прачытаў, урыукі з мастацкай літаратуры на гэтую тэму.

І раптам у аудыторыі устанавілася цішыня: дакладчык перайшоу да канкрэтных прыкладаў...

Зараз-жа пасля даклада пачалася мастацкая частка. Вось тут і забіла магутным струменем невычарпальная крыніца талентаў студэнтаў філфака.

Спачатку, калі пачыналіся арганізоўваць вечар, кожны з студэнтаў, да каго падыходзілі Герус, Бандарэнка, Жураўская з прапановай прыняць удзел у мастацкай самадзейнасці, здзіулена адступаўся.

— Што? Мне выступіць? Ды які-ж я артыст?

Але актывісты былі настойлівыя, і у выніку ў час канцэрта роуны бархатны тэнар Сашы Кійранена змяняўся мяккім барытонам Жэні Клімава. Чэшская полька, якую выканалі Люся Грышачкіна і Ала Лушчан змянілася рускім танцам у тым жа выкананні, прачытаны з майстэрствам сапрауднага артыста студэнткай аддзялення журналістыкі Галяй Івановай верш Маякоускага «Каханне»—фельетонам «Наш Вова», які выдатна прачытала другакурсніца аддзялення рускай мовы і літаратуры Эля Шалаева...

Дауно не бачылі студэнты філфака такой самадзейнасці. Калі-ж адгучэла апошняя песня канцэрта, пачаліся танцы.

— А добрае гэтае слова «дружба», ці не праўда?—гаварыу, чамусьці уздыхаючы, трэцякурснік аддзялення журналістыкі Барыс Ульянка сваёй партнёршы студэнтцы другога курса Люсі Якубенка і лёгка імчауся з ёй у імклівым віхры «Школьнага вальса».

— Так, дружба паміж нашымі курсамі павінна мацнець,—адказала Люся, а Барыс яшчэ мацней уздыхнуу...

А побач, у суседняй аудыторыі—гульні, атракцыёны, латарэя.

— Смялей, Віця, прыгай, — падбадзёрваюць, стаяўшага на вагаючыхся катках студэнта аднакурснікі. Калі той прыгнуў і дасягнуў намалёванай крэйдай рысы і калі латарэйны білет быў выйграны, Ляксуцін і Яскевіч, арганізатары гульняу, урачыста уручылі прызы.

— Заутра зноу за працу. А адпачылі мы сёння сапрауды выдатна,—радасна гаварылі будучыя педагогі і журналісты, вяртаючыся ў свой інтэрнат па вуліцы Бабруйскай і завязаушыеся дружбу рашылі умацоуваць заусёды.

В. ПАЎЛОВІЧ.

АГЛЯД ДРУКУ

РЭГІСТРАТАРЫ ПАДЗЕЙ

Нашы спартыуныя насценныя газеты закліканы усебакова і ярка асвятляць на сваіх старонках шматграннае спартыунае жыццё калектыва буйнейшай ВНУ рэспублікі, настойліва змагацца за далейшае паляпшэнне вучэбна-спартыунай і спартыуна-масавай работы.

Агульнауніверсітэцкая газета «Спорт»—орган низавога совета ДСТ «Буравеснік» і кафедра фізкультуры і спорту дрэнна спрауляюцца са сваімі абавязкамі. Апублікаваныя матэрыялы часта носяць выпадковы характар. Рэдакцыя не сканцэнтроувае увагу чытача на асноуных пытаннях фізкультурнай работы, у яе дзейнасці адсутнічае мэтанакіраванасць. Многія карэспандэнцыі і артыкулы павярхоуныя, напісаны у інфармацыйным стылі, не утрымліваюць глыбокага аналізу, патрэбных вывадау і абагульненняу. Для газеты характэрна роля непатрабавальнага рэгістратара падзей.

Гэта бачна перш за усё па характару надрукаваных матэрыялау. Самі загалоукі красамоуна гавораць аб гэтым. Так, напрыклад, у апошнім нумары надрукаван рад матэрыялау: «С ответным визитом», «Встреча с мастером», «На четвертом месте», «Спортивный вечер», «Финал первенства» і г. д.

Дарэмна было-б шукаць у газеце сур'ёзнага аналізу пастаноукі спартыунай работы, крытыкі недахопау, якія былі выкрыты у час спаборніцтвау.

Напрыклад, разгледзім перадавы артыкул гэтага нумара. Называецца ён «Наши задачи». Чытач у праве чакаць, што размова пойдзе аб тых задачах, якія стаяць перад спартсменамі універсітэта напярэдадні Спартакіяды народау СССР. Але дарэмна! У артыкуле увогуле гаворыцца аб тым, што Спартакіяда народау з'явіцца буйнейшай дэманстрацыяй спартыуных сіл краіны і што да яе патрэбна добра падрыхтавацца. А вось аналізу сапраўднага становішча спрау ва універсітэце няма.

Уся газета стракаціць заклікамі: «...Мы павінны дасягнуць...», «...для гэтага трэба паспець...» і г. д. А справы, канкрэтнай справы, не паказана.

Аднастайны і пануры выгляд старонак спартыуных газет хімічнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў. Тут не знойдзеш жывых замалёвак, цікавай інфармацыі, змястоунага артыкула. Гэтыя газеты чамусьці адводзяць вельмі многа месца пад такія матэрыялы, як «38 лет Советской Армии», «Международный женский день». У апошнім нумары газеты хімфака «На старт» змешчан усяго адзін матэрыял на спартыунуюю гэму «Скоро соревнования». Ён займае не больш 10 радкоу. Гэта інфармацыя аб тым, што хутка пачнуцца спаборніцтвы. А вось аналізу, канкрэтных фактаў падрыхтоукі да спаборніцтваў няма. Чытач не даведаецца, як абстаяць справы на факультэце з рознымі відамі спорту. А яму-б вельмі хацелася гэта ведаць!

Мова газет сухая, цяжкая, засмечана мноствам канцылярызмаў. Сустракаюцца фразы і звароты, складзеныя наперакор правілам і нормам мовы.

Так, у агульнауніверсітэцкім «Спорце» можна сустрэць такія двухсэнсавыя выразы, як «...хуже выступали наши мужчины, среди которых лучшим (?) был Л. Кабанович».

Неабходна перабудаваць работу рэдакцый гэтых газет. Ім трэба вызваліцца ад неуласцівай ім ролі пасіуных сузіральнікау падзей. Грамадскія арганізацыі універсітэта на насценны спартыуны друк павінны звярнуць самую сур'ёзную увагу.

Н. БАНДАРЭНКА.

Бывае...

...што студэнткі II курса хімічнага факультэта Канцур, Маставая, Бабрауніцкая замест таго, каб уважліва слухаць лекцыю, размауляюць, чытаюць мастацкую літаратуру, займаюцца ічшымі пабочнымі справамі. І гэта робяць яны на лекцыях па асновах марксізма-ленінізма, арганічнай хіміі, колькаснага аналіза. Каб ніхто не перашкаджау, яны садзяцца заусёды за апошні стол.

...што у нашай студэнцкай сталовай да двух гадзін дня застаецца толькі адно або два першых блюды і адно—другое. Гэтым другім і з'яуляецца катлета, якая каштуе больш трох рублёу.

...што да практычных заняткаў па мінералогіі ніхто са студэнтаў другой групы II курса аддзялення геалогіі не рыхтуецца. А таму і заняткі праходзяць неактыуна. Дрэнна рыхтуюцца тут і да семінараў па асновах марксізма-ленінізма.

...што на семінарскія заняткі спазняюцца студэнткі аддзялення геаграфіі Бергер, Захарэнка, Сямёнава.

...што студэнты I курса гістарычнага факультэта Алег Ждановіч і Яугеніи Бусел не выконваюць дамашніх заданняу па замежнай мове. І бывае гэта амаль кожны раз.

Рэдактар А. ВОЛК.

ИЗВЕЩЕНИЕ

В АПРЕЛЕ 1956 ГОДА СОСТОИТСЯ ОБЩЕУНИВЕРСИТЕТСКИЙ **ДИСПУТ** НА ТЕМУ: **«ПРОБЛЕМА ПРЕКРАСНОГО В ИССКУССТВЕ И ДЕЙСТВИТЕЛЬНОСТИ».**

ОСНОВНЫЕ ВОПРОСЫ:

1. ПРЕКРАСНОЕ В ЖИВОЙ И НЕЖИВОЙ ПРИРОДЕ.
2. ЧЕЛОВЕК — «ВЕНЕЦ ПРИРОДЫ» И «ЗВУЧИТ ГОРДО».
3. ПРЕКРАСНОЕ И БЕЗОБРАЗНОЕ, ВОЗВЫШЕННОЕ И НИЗМЕННОЕ В ЧЕЛОВЕКЕ.
4. В СОВЕТСКОМ ЧЕЛОВЕКЕ ДОЛЖНО БЫТЬ ВСЁ ПРЕКРАСНЫМ.
5. ПРЕКРАСНОЕ И БЕЗОБРАЗНОЕ В ОБЩЕСТВЕННОЙ ЖИЗНИ ЛЮДЕЙ.
6. ПРЕКРАСНОЕ ЕСТЬ ТРУД.
7. ПРЕКРАСНОЕ, ЭТИЧЕСКОЕ И ЭСТЕТИЧЕСКОЕ В ИСКУССТВЕ.
8. СОЦИАЛЬНЫЙ И ЭСТЕТИЧЕСКИЙ ИДЕАЛ ЧЕЛОВЕКА.
9. ФОРМЫ И СПОСОБЫ ВОСПИТАНИЯ ПРЕКРАСНОГО В ЧЕЛОВЕКЕ.
10. БОРЬБА ПРОТИВ ОТВРАТИТЕЛЬНЫХ ПЕРЕЖИТКОВ И УРОДЛИВЫХ ЧЕРТ ХАРАКТЕРА В НАШЕЙ СРЕДЕ.

Вступительное слово («Из истории и теории понятий прекрасного и безобразного как эстетических категорий»), заключение и консультации проф. И. В. Гуторова.

Справки по вопросам библиографии в справочном библиографическом отделе библиотеки.

ТОВАРИЩИ СТУДЕНТЫ, АСПИРАНТЫ, НАУЧНЫЕ РАБОТНИКИ И СОТРУДНИКИ БГУ, ГОТОВЬТЕ СВОИ ВЫСТУПЛЕНИЯ!

КАФЕДРА РУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ,
БИБЛИОТЕКА БГУ.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 02960 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 363. Тыраж 2000.